Наш
раён
1928
№2

и-
-
ия
.
-
и
-
у,
-
э-
цу-
э-
ам,
р-
ыки
лиз-
раф-
ы
й на
икоу

Пазнай свой край!

НАШ РАЁН.

ЧАСОПІСЬ

Барысаўскага Раённага Таварыства Краязнаўства.



№ 2.

г. БАРЫСАЎ
1928 г.



КРАЯЗНАУСТВА У ПРАЦЫ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Краязнаучая праца у асноуным будзе праходзіць наступныя этапы: арганизацыя краязнаучых сил; падлик аб"ектау,якия падлягаюць вывучэньню у данай мясцовасьци; плянавая дасьледчая праца у розных галинах гаспадарчага и культурнага будауництва; папулярызацыя вынікау дасьледчай працы(пастанноукай дакладау,праз друк) з мэтай дапамоги дзяржауным органам и грамадзким арганизацыям у социялистычным будаунцтве сваей краины. Зусим зразумела пагэтаму неабходнасьць щснай сувязи краязнаучых арганизацый з гаспадарчыми устанавами, прафэсыянальными и грамадзкими арганизацыями,якия маюць сваей мэтай плянавае и арганизаванае социялистычнае будаунцтва.-

Рабочыя масы,якия будуюць гаспадарку на новых началах, творацъ сваю пралетарскую культуру и новы быт,павинны добра ведаць мясцовыя прыродныя багацьци,мясцовую гаспадарку,быт и звычаи насельництва,бо ва усякім будаунцтве перш за усе трэба выходзиць з канкрэтных ,рэальных запатрэбаваньняу и мясцовых магчымасьцяй.Пры вырашэньни,напрыклад, пытаньня аднонна забасьпечаньня прамысловага прадпрыемства мясцовай сыравинай,неабходна ведаць магчымасьци запасау и дастауки гэтае сыравины; пры складаньни и абгаварэньни вытворчай праграмы неабходна ведаць запатрэбаваньни рынку,попыт на продукты вырабу; пры наладжэньни культурнай сувязи з вескай трэба добра ведаць социяльна- эканомичнае становишча гэтае вески,мясцовае звычаевае права,культурныя запатрэбаваньни насельництва и г.д. Тым больш неабходна усебакова ведаць сваю краину-Прафсаюзным працауникам,якой бы кваляфикацыи яны ня были.

У штодзеннай буднишнай працы усих кируючых установу патраб-

-на практычнасьць, жыцьцевасьць, веданьне бліжэйшых задач и мясцовых магчымасьцяй.. Нельга, напрыклад, складаць вытворчыя пляны, праводзіць вытворчыя нарады, калі ня ведаць усіх вытворчых сіл свайго раёну. У гэтым напрамку неабходна даць належныя веды і усім рабочым. А паглядзім, як праводзіцца у нас культасьветная праца на прадпрыемствах і сярод сябрсу саюзау? Ці многа там пастаулена дакладау, прачытана лекцый на тэмы мясцовай гаспадаркі, культуры, быту? Саюзнымі арганізацыямі у гэтым напрамку зроблена вельмі мала. Краязнаучых гурткоу, нават пры буйных прадпрыемствах мы яшчэ ня бачым. У саюзных бібліятэках адсутнічае краязнаучая літаратура. А яна вельмі и вельмі была-бы патрэбна и у першую чаргу для кірауніку саюзнай працы.

Такое становішча, зразумела, нельга прызнаць нармальным. Саюзным арганізацыям неабходна наладзіць цесную кантактную працу з мясцовымі краязнаучымі арганізацыямі, выкарыстоуваючы вынікі их дасьледчай працы у сваей практычнай працы, а тым самым праверялася б и праца краязнаучых арганізацый у напрамку выбару аб"ектау дасьледваньня и устаноукі падыходу да гэтых дасьледваньняу.

Асабліва шырока можна было б выкарыстаць краязнаучыя арганізацыі дзеля пастаноукі дакладау и гутарак аб мясцовым краі, яго гаспадарцы, культуры, гісторыі, быце. Але дзеля гэтага неабходна дапамога саюзных арганізацый.

Краязнаучыя арганізацыі маглі б далей прыняць удзел у складаньні сьпісу краязнаучай літаратуры для саюзных бібліятэк, у дапамове вывучэньня некаторых пытаньняу жыцьця и быту рабочых, мінулага у жыцьці таго ці іншага прадпрыемства и г. д. Гэтыя дадзеныя патрэбны былі-б як для краязнаучай, так и для саюзнай арганізацый.

Саюзныя арганизацыи з свайго боку магли б больш дапамагчы краязнаучым арганизацыям у их працы.Перш за усяго Саюзныя працауники магли б дапамагчы краязнаучым арганизацыям у папулярызацыи краязнаучае справы,магли б супрацоуничаць,даваць належныя матар"ялы для краязнаучых арганизацый и.г.д. Вельми значную дапамогу магли б аказаць саюзныя арганизацыи у зборы розных матар"ялау и экспонатау для мясцовых краязнаучых музэяу:прадуктау вырабу таго ци инш. прамысловага прадпрыемства,дыяграм и г.д. Саюзныя и Краязнаучыя арганизацыи магли б сумесна наладзиць шэраг экскурсий з рабочыми у прыроду,у сельскую гаспадарку,у музэи и инш.

На фабрыках,заводах, у мясцкомах и завкомах часта маюцца досыць каштоуныя матар"ялы па гисторыи рабочага руху, некаторыя дадзеныя з часоу барацьбы за Савецкую Уладу,матар"ялы па гаспадарчаму и культурнаму будауництву -усе гэта вельми патрэбны краязнаучы матар"ял.Быту рабочых и служачых розных профэсыи,умовы их жыцьця,культурныя запатрэбаваньни магчыма вывучаць ня тольки па писаным матар"ялам, (пратаколам сходау,насьценным газэтам) ци шляхам экскурсий,вывучэньне гэтых пытаньняу павинна быць працяжным у штодзенным жыцьци.А такия дадзеныя магчыма атрымаць тольки ад самих рабочых,служачых ци саюзных працауникоу,якия блиска стаяць да саюзнай масы.

Неабходнасьць наладжаньня належнай сувязи у працы Прафсаюзных и краязнаучых арганизацый видавочна.Пашэтаму мы личым патрэбным:

1.З боку краязнаучых арганизацый:

а). парыядычна ставиць даклады и праводзиць лекцыи на краязнаучыя тэмы сярод сяброу Саюзау;

б). уцягнуць у краязнаучую працу саюзных працауникоу

и найбольш актыуных рабочых и служачых.

в).даваць належныя спраукі и матар"ялы па вывучэньню мясцовага краю.

г).дапамагаць у арганизацыи и правядзеньни краязнаучых экскурсыи з рабочыми и служачыми;

2. З боку прафсаюзных организацый:

а).прыняць належныя меры да магчыма шырокага азнаямленьня сяброй саюзау з краязнаустваи, яго задачами и практычнай працай,

б).прыняць актыуны удзел у працы мясцовых краязнаучых организацый, даючы належныя зьвесткі, матар"ялы, экспанаты у музэй и инш.;

в).саюзныя библиятэки папоуниць литаратурай аб мясцовым краи.

г).пэрыядычна праводзиць краязнаучыя экскурсыи у прыроду, прамысловасьць, для азнаямленьня з культурными помниками.

В.САМЦЭВИЧ.

ДЗЯРЖАУНЫ ПАЛЯУНИЧЫ ЗАКАЗЬНИК.х)

Напэуна, ня усе насельництва нашага раену ведае аб тым, што у Пауночна-Заходним кутку бышай Барысаускай Акруги, каля раки Бярэзины, на поунач ад возера Пялик, есьць Дзяржауны Паляуничы Заказьник. Утворан ен Пастановай Саунаркому БССР, ад 31 студзеня 1925 г. Прычыны, якия выкликали утварэньне гэтага заказьника были наступныя: импэрыялистычная вайна 1914-18 г.г., а потым и грамадзянская вайна вельми цяжка адбилася на прыродзе Нашага Краю. За гэты час были зьнишчаны вялікия плошчы лясоу, а разам з лясами загинула шмат каштоу-

---

х).Знаходзицца часткамi у Барысаускім, Халопеницкім, Лепельскім, Бегамльскім и Плешчаницкім раенах.

ный паляўнічай жывёлы засьці, як напрыклад: лосеў, баброў, дзікіх коз і іншых. І вось, каб не допусьціць далейшага зьнішчэньня гэтых кантоуных як з навуковага, так і з эканамічнага пункту погляду жывёл і утворан вышэйпамянёны заказьнік плошчай у 65.000 дзес. (з якіх 46.000 дзес. пад лесамі, а астатняя пад сенажацямі і азёрамі).

Межы заказьніка цягнуцца амаль-што на 200 верст. Крайнія пункты яго ляжаць на 53 вярсты адзін ад аднаго.

Па апошнім зьвесткам (ад 10 сакавіка 1926 г.), якія былі прысланы у Расійскае Таварыства з гадчыкам заказьніка т. Гурыным відаць, што заказьнік зараз ахоўваецца 7 лясьнікамі (егерамі), аб"езчыкамі пры 3-х чалавеках адміністрацыі.

Калі параўнаць сучасную колькасьць дзікіх жывёл і птушак, якія знаходзяцца у заказьніку, з тымі лічбамі, якія меліся пры утварэньні яго, то заўважваюцца значныя дасягненьні. У сучасны момант па наяўным дакладным дадзеным маюцца наступныя жывёлы:

Мядзьведзяў--13 штук; ёсьць прыплод.

Ваўкоў - мала. Тлумачыцца гэта тым, што у межах заказьніку мала насельніцтва, а па другое з імі вядзецца барацьба шляхам адстрэлу і атравы.

Лісіц: за апошнія гады настолькі павялічыліся, што колькасьць іх не паддаецца падліку.

Рысяў: маецца 9 штук. З тое прычыны, што рысь зьяўляецца шкодным драпежнікам (зьнішчае шмат розных дзічыны), з імі вядзецца барацьба.

Барсукоў: -10 штук. Водзяцца галоўным чынам, у Заходняй частцы заказьніка.

Куніцы: лясная, дзякуючы строгім мерам Ахове, за апошнія гады так моцна значна размножылася і канчаткова выжыла з заказьніку белку.

Выдры: - водзяцца па усіх рэчках і затонам. Размнажэньне яе ідзець вельмі добра.-

Норкі: Пладзяцца лепска.

Бабры: Размножыліся у значнай колькасьці. Па дадзеным праф. Федзюшына ("Наш Край" №1, 1926 г.") баброу было зарэгістравана 32 сям'і (а зараз іх налічваецца 32 сям'і). Хаткі бабровы раскіданы па верхняй Бярэзіне, на азёрах і канавах Заказьніку. Трэба адзначыць, што ня толькі у Савецкім Саюзе але па усім сьвеце бабры амаль што зьнікалі. Вось чаму бярэзінскае паселішча баброу трэба лічыць надзвычайна каштоуным. (Бабры штучна захаваліся толькі у Паунчнай Амэрыцы, у Паудневай Нарвэгіі, у Нямеччыне на Эльбе і у паудневай частцы Францыі). У Савецкім Саюзе бабры захаваліся на Беларусі, на Украіне і у Тамбоускай губ.

Захаваньне бабра у Заказьніку і яго пасьпяховае размнажэньне зьяуляецца вельмі важным як з навуковага, так і з эканамічнага пункту погляду (шкурка іх ідзе на хутра).

Ласі: У час праектаваньня Заказьніку (у сьнежні 1924 году) камісія знайшла тут сьляды прысутнасьці 4-6 штук. Зараз іх маецца больш 40 штук. Прыплод ідзе задавальняюча. З восені 1927-28 году практыкавалася падкармліваньне іх. Вынікі добрыя.

Казы: Дзякуючы прынятым мерам аховы (адмежаваньне палясных пастбішчных участкау, зьнішчэньне брадзячых сабак і наогул барацьбы з драпежнікамі) размнажэньне ідзе досыць шпарка. Зараз маюцца статкі на месцах стаянак па 13 шт. Агулам у Заказьніку налічваецца да 300 коз. Узімку вядзецца падкармліваньне.

Дзікі (Дзікія кабаны), якія раней амаль былі зьнішчаны зараз ужо ня лічуцца рэдкасьцю у Заказьніку. У сучасны момант іх зарэгістравана да 15 штук. Вядзецца падкармліваньне.

Што датычыцца птушак, так іх зараз развялося у Заказьніку вельмі многа. Так, па азначэньню месц токаваньня, глушцоу субтракаецца шмат, пры чым трэба адзначыць, што яны у значнай колькасьці гінуць ад лісіц, якія зьнішчаюць іх гнезды.

[illegible]

[illegible] ... у Беларусі ... [illegible]

[illegible] ... на Беларусі ... губ. [illegible]

[illegible]

добра.

[illegible] ... 500 ... [illegible]

[illegible]

Колькасьць цяцяркоу, рабцоу, белых курапатак не паддаецца падліку. Таксама шмат водзіцца плаваючых і балотных птушак, як вутак, гагар, жураўоу і інш.

У сучасны момант ідзець падрыхтоучая праца да перасяленьня з межау Заказьніка 112 хутароу, а таксама мяецца на увазе правесьці лесаупарадкаваньне дач Заказьніка. Гэтыя мерапрыемствы забясьпечаць лепшае вядзеньне як хутравой, так і пернатай дзічы.

З прычыны неразуменьня мясцовым насельніцтвам ролі і значэньня Заказьніка, заўважваюцца яшчэ выпадкі браканьерства, з якім вядзецца рашучая барацьба. За зіму (1927-28г) паадбірана у браканьераў 2 стрэльбы і выключана з Саюза Паляунічых 6 чалавек. Райвыканкомы у гэтай справе заусёды прыходзяць на дапамогу.

Пры Дзяржауным Заказьніку маюцца гадовальнікі (пітомнікі) хутровых зьвяроу з спэцыяльнымі вальерамі, у якіх у сучасны момант утрымоуваюцца тры пары лісіц.

У выніку добрага прыплоду будзе набыт чорна-буры прайзвадзіцель.

Кіраунацтва Заказьніку хадайнічае аб набыцьці новых экзэмпляроу жывёл і птушак (фазаноу і інш.) Увосень 1927г. Заказьнік прыняу удзел у сельска-гаспадарчай выстауцы у м.Халопенічах. Сваімі экспанатамі ён вельмі зацікавіу мясцовае насельніцтва і атрымау дыплом 1 ступ.

С.П. [illegible]

КРЫНІЦЫ: 1. Зьвесткі, прысланыя загадчыкам Заказьніка т.Гурыным ад 10/III-28 году.
2. А.Федзюшын "Дзяржауны Паляунічы Запаведнік БССР (Наш край №1-1926 году).

СРОДКИ ПАВЯЛИЧЭНЬНЯ УРАДЖАЙНАСЬЦИ ЗИМОВАГА ЗБОЖЖА.

(Па дасьледваньню Стара-Барысаўскага сель.гас-падарчага Тэхникуму).

БССР зьяўляецца краінай, у якой свайго хлеба не хапае и з гэтае прычыны значная частка яго прывозицца з поўдня. Аднак па вырабу зерневых прадуктаў Беларусь магла б павялічыць нават без пашырэньня плошчы засеву зерневой збожжы. Дзеля гэтага неабходна толькі прыняць пэўныя меры да павялічэньня ураджайнасьці зерневых культур.

Галоўнейшым сродкам падняцьця ураджаю азимовага збожжа зьяўляецца перш за ўсяго жывёльнае угнаеньне. Па даных Стара-Барысаўскага Вопытнага поля жывёльнае угнаеньне у колькасьці 2400 пудоў на дзесяціну павялічвае ураджай зимо-вага жыта (з 45 да 90 пудоў на дзесяціне). Пагэтаму у сялянскіх гаспадарках асаблівую увагу трэба зьвярнуць перш за ўсё на павялічэньне жывёльнага (навознага) угнаеньня. У гэтым напрамку першай мерай трэба лічыць пабудову глінабітных падлог на дварох для скаціны, каб без патрэбы и без усякай карысьці не прападала гнаевая жыжка, якая мае у сабе найбольш патрэбную матэрыю- азот. Неабходна потым прыступиць да загатоўкі на балотах торпу для падсьцілкі скаціны. Торп звычайна вясной рэжацца цаглінамі, сушыцца, потым некальки разоў на працягу лета перакладваецца у кучках па 5 штук цаглин у кожнай, а далей уже сухи складваецца у штабели каля балота и возицца звычайна зимой у двор.

Дробна раскрышаны торп кожны дзень на двары дзеля скаціны пасыпаюць пад ногі скаціне па развлику 5 фунт на кожную жывёлину и зьверху накрываюць яшчэ пластам саломы 4-5 фунтаў (на адзинку). Пры ужываньні на падсьцілку торпу павялічваецца у сялянскай гаспадарцы угнаеньне и якасьць яго

палепшаецца. Апрача павялічэньня мясцовага угнаеньня ураджай жыта можна павялічыць таксама раньнімі папарамі. Вопыты Старо-Барисаўскага Тэхникуму паказали, што самыми лепшими папарами зьяуляецца красавиковы, г.е. таки, падымацца(ўз ст[illegible] якога робицца не пазьней 1 мая. Угнаеньне на таки папар трэба вывазиць зимой.

Падрэнныя вынікі даюць таксама папары, якия угноены зьвельным гноем и заняты вяравай мешанинай. Гэтыя папары выгаднейшы чыстых папараў, бо павышаючы ураджай азимовага зборжа, яны у той жа самы час даюць и ураджай викавога сена, што пры недахопе карму у сялянскай гаспадарцы, бязумоўна, мае вяликае значэньне.

Да фактараў, якия садзейничаюць павялічэньню ураджаю азимовага зборжа, трэба аднесьци таксама раньни пасеў. Азимку трэба сеяць не пазьней 20-25 жнiўня(н.с) у колькасьци 10-11 пуд на дзесяцину. У дажджлывыя гады насеньне запахваць (заделывать), а у больш цяжкіх глебах нашага раёну, проста пад барану, кали, бязумоўна, няма радковой сеялки. Сялянскае насеннае зярно часта бывае дробнае и нячыстае. Ачыстка насеннага зярна и абмен насеньня на лепшыя сорты даюць пры угноенай и добра апрацованай глебе прыкметныя выники у сэнсе павялічэньня ураджаю.

Пры недахопе у сялянскай гаспадарцы угнаеньня неабходна шырока прапагандыраваць сярод сялянства лубин на зяленае угнаеньне у папары.

Добра узрошчаны на папары лубин дае ураджаи, якия мала адрозьниваюцца ад угнаеннага папару. Лепшым для Барисаўшчыны будзе сины лубин, яки вясной на ране успаханым папары высяваецца у колькасьци 13-14 пуд на дзесяцину пад барану. Дзеля высокага ураджаю лубину вельми важна, каб глеба была бульбинковыми бактэрыями. А дзеля гэтага(кали никoли раней на гэтым поли ня сеяуся лубин) неабходна рабиць заражэньне

[illegible] шифра и [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] Техницу у [illegible] [illegible]
и перед [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible]

[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] и пре
[illegible] чистог папира, [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
при [illegible] [illegible] у [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible]

[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
ку [illegible] [illegible] 20-25 [illegible] [illegible]
10-11 [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] и [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] у [illegible].

При [illegible] у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] у [illegible].

[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]

глыбін. У таким выпадку беруць [illegible] г[illegible] зямли з поля, на яким расьци ужо рас лубин, паливаюць [illegible] вадкаю [illegible] да утварэньня рэдкай грязи и перамешваюць яе з насеньнями семянами, пасьля чаго их падсушваюць (але ни у яким выпадку не на прамени сонечным сьвеце, бо инакш бактэрыи загинуць и зараджэньня не адбудзецца). Для павялічэньня ураджаю зямли мае [illegible] п[illegible] лубин раицца угнаиць пры пасеве 12-15 пуд. суперфосфату ци 15-20 пуд. касьцянай муки ци томасшлаку.

У пачатку [illegible], калі лубин завядзе "стручки" яго заворываюць.

Лубинавыя папары асабліва не раяць на легких пясчаных глебах, на палях, якия знаходзяцца у далекай адлеглясьци ад вески и на якия цяжка [illegible], на [illegible] вазиць [illegible] угнаеньне.

С. Т.

З ГИСТОРЫИ Ф. [illegible]АБР[illegible] "ВИКТОРЫИ" (у Барысаве).

Фабрика "Викторыя" была заснавана у 1885 г. Заснавали яе Барыс Рыгоравич САЛАМОНАУ и яго супольник Гиршман. Гэсем кiравали яны прадпрыемствам сумесна да таго часу, калi Гиршман загинуу пры крушэньни цягнiка. Тады Саламонау, выплацiушы удаве Гиршмана належачую ей долю, узяу да сябе у супольники нейкага аптэкара Ленберга. Калi-ж вырас сын Саламонава, дык Ленберг мусиу вярнуцца да свае аптэкарскае справы, а Саламонавы, сын з бацькам, сталi сами гаспадарыць и кiраваць прадпрыемствам. Фабрыка "Викторыя" мела тры аддзяленьни: сярнiковае, фанернае и лесапильнае.

У першыя часы прадпрыемства пабудавана было вельми прымитыуна. Паравой машыны ня было, а станки прыводзили у рух рукамi (паравую машыну пастаулили тольки у 1902 годзе) доб-

рні будынку зусім не было, а станкі стаялі пад паветкамі. Пры такіх умовах прыходзілася працаваць зімою на марозе у 20-25°. Рабочыя павінны былі укручвацца у дзесяць лахманоу (спэцвопраткі не давалі), а рукі усе-такі качанелі и працаваць было немагчыма. Пасьля пабудавалі былі драуляныя будынкі, але яны пастаялі нядоуга: у хуткім часе згарэлі. Замест іх было пабудавана двух-павярховы будынак. Але и ён згарэу. Пачалі будаваць каменныя будынкі, але Салямону падпальвалі іх разоу дзесяць, каб атрымаць страхоуку. Яна-то і узмацніла яго. У гэты час рабочым прыходзілася заставацца без працы и бадзяцца па іншых заводах, шукаць хлеба. А калі фабрыка и працавала, дык рабочым прыходзілася усе роуна вельмі цяжка. Працавалі 12 гадзін з паловай, а толькі пасьля рэвалюцыи 1905 году працоуны дзень зьменшууся да 10-ці гадзін. Рабочыя, за дзень такой надзвычайна цяжкой працы атрымоувалі капеек 50. Найку-мой прыходзілася малым, якія складалі палову рабочых. Працавали яны па руках з дарослымі рабочымі. Сталялося да таго, што рабілі у прыбіральні з дзеучыкі и тым адпачывалі, а то дык засыпалі у станка пры рабоце. За сваю працу атрымоувалі яны 10-15 кап. За нязначныя праступкі з рабочых зьдзіралі штрафы у 15-20 кап. (пры 50 кап. зарабку).

Салямону з сям"ёй жылося у вельмі раскошна. Меу два дамы у Барысаве и два у Менску. Прадпрыемствы былі наступныя: фабрыка "Вікторыя" у Барысаве, у [illegible]-сярніковая фабрык. и друкарня. Меу швейцарскі кавалер-рысак у и аутамабіль, што у тыя часы лічылася неслыханаю раскошшу. Трымау восем сабак, якія каштавалі 150 р. кожная.

На умовы працы рабочых Салямону мала зьвяртау увагі.

---

1) З матэр"ялау школьнай экскурсіі. Апрацавалі вуч. 7 групы Вопытна-Практычнай школы. Бабіцкая А., Бродкіна С., Зербсі А. и Фрыдляндэр Р. пад кіраунніцтвам тав. Сашэвіча.

1905 годзе били стачки и забастоуки. Станки стаяли, и хуль Саламонату ня выканау запатрабаваньня рабочих. 16 студзеня 1905 году каля фабрыки сабралася каля 200 рабочих. Тут зьявилася полиция, але рабочыя на яе ня зварочвали увагн, и на угавори полицыи разайцися - адказвали крыками" УРА" ,а патоупу чутны били выкрыки " далоу самаулядзтва". Так паутаралася и назаутра. Пасьля таго ,як рабочия били разагнаны полицыяй, били знойдзены праклямацыи. 25 красавика рабочыя зусим забаставали и трэбавали ад Саламонава паляпшэньня свайго эканамичнага станоувишча. Тады Саламонау зьменшыу рабочы дзень и выпаунилу запатрабаваньни рабочых. Пасьля гэтага рабочыя приступили да працы. У час Кастрычникавай рэвалюцыи и акупацыи фабрыка працавала з перарывами да 1920 году, у якім была спалена пры адступленьни бел-палякау.

Напалову зруйнаваныя будынки фабрыки(як и ўсяго рухом гораду) на працягу трох год вельми красамоуна сьведчили аб "культурных" учынках польских паноу ,аб их "клопатах" аб працоуных масах. Савецкая улада усё-такі змагла у 1923 годзе приступиць да адбудовы разьбитых корпусау б. фабрыки "Викторыя" .У 1923 г. тут ужо пачынае працаваць электрастанцыя, у 1925 годзе пускаецца у ход лесапильны завод ,у адным з корпусау пераносицца друкарня ,а у 1926 годзе адчыняецца лесапильнае Аддзяленьне .

--:о0о:--

1908 р. [illegible] От нам [illegible]
[illegible]
1908 [illegible] 200 [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible] 1928 [illegible]
[illegible]

[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible] 1928 р. [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible] 1928 [illegible]
[illegible] 1935 [illegible]
[illegible]

ЛЕСАПІЛЬНЫ ЗАВОД БАР[illegible] [illegible] КАМБІНАТ x)

1. Месцапала[illegible] [illegible] кароткая гісторыя заводу.

Лесапільны завод Барысаўскага камбінату, які аб"ядноў прамысловыя прадпрыемствы мясцовага значэньня, знаходзіцца у горадзе Барысаве, па вуліцы Ш-га Інтэрнацыяналу, на левым беразе рукава ракі Бярэзіны.

Географічныя умовы для працы прадпрыемства досыць спрыяючыя, бо па рацэ, галоўным чынам, дастаўляецца лесаматэр"ял для патроб прадпрыемства. Ад чыгуначнай станцыі прадпрыемства знаходзіцца у адлегласьці каля 4-х кілёметраў. Лесапільны завод (і тая-ж электрастанцыя і друкарня) знаходзяцца на месцы бяўшай фабрыкі "Вікторыя" Сал[illegible] ,якая была разьбіта знарадамі пры наступленьні бел[illegible]-палякаў. у 1920 годзе. Былыя корпусы знаходзіліся у руінах да 1923 году, калі Савецкая улада [illegible]дала в гэтых напаўразьбітых корпусоў адбудавала пад электрастанцыю, а у 1925 годзе быў умо[illegible]дчынен лесапільны завод і перанесена друкарня.

Лесапільны завод быў пабудаваны з мэтай забясьпечыць пілаваным матэр"ялам будаўнічыя запатрабаваньні камунальнай гаспадаркі і даць танных паліва(абрэзкі, апілкі) для электрастанцыі.

П. Рабочыя сіла і умовы працы.

У сучасны момант на заводзе працуе 65 чалавек, з якіх 60 мужчын в3 жанчыны і 2 падлеткі.

---

x). Артыкул напісан па матэр"ялам школьнай экскурсыі вучн. УП групы Вопытна-Практыкавальнай школы: А. Варцінскай, М. Апялінскай, П. Лазарук, А. Дзямідчык і М. Турчыновіч(пад агульным кіраўніцтвам В.И. Самцэвіча.

Паступовы рост рабочае сілы відаць з наступнае табліцы:

Катэгорыя рабочых	24-25	25-26	26-27	27-28 г.
Рабочых	27	47	49	60
малодш. абслуг. персаналу	2	2	2	2
служачых	6	3	3	3
Усяго	35	52	54	65

Лік рабочых на заводзе, як бачым, павялічваецца з кожным годам у сувязі з пашырэннем вытворчасьці заводу. Рабочая сіла папаўняецца выключна праз Пасрэдніцкае Бюро. Рабочыя і служачыя працуюць па 8 гадзін, [illegible] па 6 гадзін.

Завод працуе на дзьве зьмены. Санітарныя ўмовы нельга прызнаць здавальняючымі. Усюды бываюць скразьнякі. Для аховы рабочых ад прастуды ім даецца на зіму цеплая вопратка (спэцвопратка): валенкі, брэзэнтавыя фартухі і рукавіцы. Рабочыя часьцей за ўсё хварэюць на прастуду. Карыстаюцца гарадзкой амбуляторыяй.

У сучасны момант зарплата рабочым выдаецца выключна грашыма два разы ў месяц. Месячны зарабак рабочага па першаму разраду узрастаў наступным чынам:

Гады	1924	1925	1926	1927 г.
Зарплата	13-25	13-75	16-25	16-95

Агульная сума зарплаты па гадох характарызуецца наступнымі лічбамі.

1924 г. IV квар.	25-26	26-27	27-28 (I кварт.)	
[illegible]879-75 кап.	31010 р.	39571 р 90 к.	10254	р.

Ш. Сыравіна.

Для заводу патрэбны наступныя віды сыравіны: сасновыя и яловыя бярвеньни (калодки) и бярозавыя круглячки для калодачнага аддзяленьня. Колькасьць расходаванай сыравины выдаць в наступных лічбау.

Назва сыравіны.	1924-25 г.г. кольк. у кб мт.	насуму	1925-26 г.г. кольк. у кб. метр.	на суму
Бярвеньне круглае..	52655,65	11409-16к	5623	113132р.
Карт.н (круглякі)..	1830	237-90	252	3115р.
Сыравины закавчыка. (бярвеньне).	16612,70 кб.фут.	4123-17	2500,98	-

Увесь матар"ял купляецца у блізкайшых лясьніцтвах и дастауляецца зімой на санях, а летам па рацэ. Захоуваецца матар-ял на беразе ракі, улетку нават у вадзе.

IV. Працэс вытворчасьці.

На заводзе для загатоукі пілаванага леса- матар"ялу: дзьве лесапільныя рамы (сист. Гофмана), у якіх распілоуваецца бярвеньне на дошкі рознай таушчыни у залежнасьці ад таго, на якую шырыню устаноулены пілы. Бярвеньне да рам падаецца з ракі спачатку па каналу да заводу, а потым бесканцовым ланцугом бярвеньне усьцягваецца на другі паверх да рам.

Непасрэдна у рамы бярвеньне падаецца на асобных вагапетках, у якіх бярвеньню прыдаецца належнае паземнае палажэньне.

Для больш дэтальнай апрацоукі дошак на заводзе маюцца: два цыркулярных станкі для разрезваньня дошак на меншыя частакі; адна канцарэзка для абрэзкі канцоу дошак и разрезкі аполкау на часткі; адна лінейная піла -для абрэзкі бокавых часьцей дошак; дзьве канцарэзкі для падрыхтоукі дошак для скрынак; адзін станок для абрэзкі дошак и 3 рэечных цыркулярк и.

[illegible] О п р а [illegible] н а.

Да би се у [illegible] потпуности [illegible] свих справа [illegible] и листи, одржавања (паковања) и одржати [illegible] [illegible]

[illegible]

дела и [illegible]

Нова справа . [illegible] 15.-- [illegible]

[illegible] 1520 [illegible]

Варување кругове.. 53855,05 [illegible] 11-05-58

[illegible] (крпомашну) [illegible] 2880 [illegible] 257-300 [illegible] 223 [illegible] 21575.

Справни материјал . [illegible] 10282,70 4113-17 — [illegible]

(материјал [illegible])

[illegible]

[illegible] у [illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Патрэбную для прывадзеньня у рух станкоу и пил энэргию завод атрымлувае з электрастанцыи, якая знаходзицца побач з заводам. Прапускная здольнасьць кожнае з лесапильных рам 1600-1700 кб.фут., прычым гэта колькасьць можа павялічвацца и памяншацца у залежнасьци ад таушчыни бярвеньня, якое расьпилоуваецца: кали бярвеньни тоустыя, прапускная здольнасьць рам павяличваецца и кали тонкия -памяншаецца. Гатовыя дошки потым выносяцца на двор и адвозяцца на склад на дварэ заводу. Апошки и абрэзки выкарыстоуваюцца на электрастанцыи для апальваньня катлоу.; гэта дае значную эканомию у паливе.

Капылачнае аддзяленьне: У капылачным аддзяленьни выпрацоуваюцца формы шавецких капылоу. Бярозавыя чурбаны ручным спосабам рэжуцца на дварэ на роуныя кавалки даужынёю у 8 вяршкоу и падвозяцца к калодачнаму аддзяленьню. Загатоуленыя з чурбаноу "балванки" устанауливаюцца у у капыльны станок, у яким выпрацоуваецца форма калодки. Капыравальных станкоу маецца два и працуюць яны на дзьве зьмены. На кожным станку за 8 гадзин выпрацоуваецца 50-55 пар калодак.

Далей калодки идуць для сушки на 3-4 дни у сушыльнае аддзяленьне. Сушацца яны парай на асобых сетках. З сушыльни калодки паступаюць у "лентачны" станок дзе у калодках выразваецца "гэста" и абрэзуюцца усе лишния часткі. Потым калодки больш выраунивающца при дапамозе рашпиля и на их ставяцца нумары для паказаньня размеру капылоу.

Урэшце калодки -капылы канчаткова апрацоуваюцца (шлифуюцца) на шлифавальных станках.

У. Продукцыя вытворчасьци:

Продукцыя вытворчасьци на лесапильным заводзе видаць з наступнай таблицы :



Гады	пілаваны матар'ял .		калодкі		кліп-лі		усяго на суму у р.	Увага.
	кол. кб.м	на суму	кольк. кб.м	на суму	кол. шт.	на суму	у рубл.	
1925-26	-3895,4- / 1500,55	156688-07 / 12159	1884,32	1707,2р.	-	-	170554,27	ня ўлічаны пакаваны вырабы па заказу з чужога матар"ялу.
26-27 г.	7703,25	243429,05.	5343,18	7545,95	18652	9794,50	310769,50	
27-28г. (1 квар.)	1605	27133	1150	29 1315	7223	[illegible]	32802 .	

У 1926-27 г.г. вытворчы плян выкананы заводам на 82%. Невыкананьне вытворчага пляну на 18%, паніжэньне продажных кошту насьці лесаматар"ялу (па пастанове Наркамгандлю), страты ад паводак у летку мінулага году-усё гэта , разам узятае, дало дэфіцыт заводу у суме 11.500 р. Апрача таго, дачнае аддзяленьне таксама працавала ненармальна: калодкі загатаўляліся не адпаведных рынкачнаму спросу гатункаў; ня было спэцыялістых, адсутнічаў цьверды плян. У сучасны момант недахопы выпраўлены: аддзяленьне працуе па цьвердых заказах ,мае спэцыялістых.

Дзеля павялічэньня вытворчасьці и палепшэньня умоў працы Камбінат мае на увазе у будучым годзе на заводзе устанавіць абрэзачную цыркулярку (на суму 1300 р.), замяніць матары пастаяннага току маторамі пераменнага току(на суму 1500 рубл), правесьці па складу вузкакалейку (2500р.) и інш.

УІ. Організацыя рабочых и культ.праца .

Рабочыя лесапільнага заводу па нацыянальнасьці падзяляюцца наступным чынам: беларусаў-39, яўрэяў- 25, палякаў-1, Саюзную працу вядзе завком .Для вырашэньня вытворчых пытаньняў склікаюцца вытворчыя нарады.

Дзеля культ-асьветнай и грамадзкай працы рабочых леса-

пильнага заводу аб"яднаны з рабочыми электрастанцыи и друкарни у агульныя організацыи Мопр"а, Т.Д.А, Авиахиму и шэфскія Т-ва .

Найлепш працуе ячэйка Мопр-у; Т.Д.Авиахиму утварылася нядауна и працы не разгарнула. У чырвоны куток падшэфнай вески Б.Негнавичы пасылаецца литаратура(у нязначным лику), часами ставяцца даклады и у часы правядзеньня тых ,ци иншых кампаний,

Культурная праца рабочых (лесапильнага заводу, электрастанцыи и друкарни) праводзицца у клюбе ,пры якім маецца читальня и библиятэка. У библиятэцы налічваецца каля 600 книг па расийскай и частка на журэйскай мове, на беларускай няма. Чытаецца галоўным чынам белетрыстыка. Рабочыя выпісваюць газэты "Рабочая газэта" "Правда", "Рабочий" и инш., беларускія газэты ня выписваюцца ,на што культкамисии трэба зьвярнуць належную увагу.

У клюбе маюцца часописи "Огонек" ,"Крокодил" .При клюбе працуюць гуртки палитычны и стралковы; працуе ликпункт, на якім навучаецца 7 чалавек. Масавую и гуртковую працу неабходна пашырыць и паглыбиць.

--ooOoo--

ГЛИНЯНАЯ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ У МЯСТЭЧКУ ЧЭРНЯУЦЫ БАРЫСАЎСКАГА РАЁНУ x)

Выраб глиняных рэчаў у м.Чэрняуцы распачаўся прыблізна у 1860 годзе. Адчыненьне тут фабрык для глинянага начыньня было выклікана тым, што каля м.Чэрняуцка маецца шмат глины,

---

x)Матэр"ялы падаў настаўник Л[illegible]уніцкай школы т.С[illegible]скевец, апрацаваў сябра Т-ва [illegible] .-

[illegible] између [illegible] у радничким електропредузећима и др[illegible] у Тузланском [illegible] Т.А.[illegible] [illegible] Т-[illegible].

[illegible] Мкр-у Т.А.[illegible] [illegible] и [illegible] по [illegible]. У [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible], [illegible] [illegible] и [illegible] [illegible] [illegible].

[illegible] [illegible] ([illegible] [illegible] [illegible] и [illegible] [illegible] у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] "[illegible]", "[illegible]" и [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible].

[illegible] "[illegible]", "[illegible]" [illegible] [illegible] [illegible] и [illegible] у [illegible] [illegible] и [illegible] [illegible] [illegible].

--- 0 ---

[illegible]
[illegible])

